11 лістапада ў 18.30 на сцэне кінаканцэртнай залы “Астравец” прайшоў Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі які прадставіў адзін з самых знакамітых і папулярных сваіх спектакляў — “Нязваны госць”.



Сюжэт пастаноўкі дастаткова звычайны – але акцёры РТБД “падаюць” яго пад не зусім звычайным соусам.

Мужчына прыйшоў да палюбоўніцы, а тут ….Зразумалая справа, вяртаецца муж….. Што рабіць? Відавочна ж- бегчы! нават высокі паверх для яго не перашкода для сапраўднага Дон Жуана. Але хто б ведаў, што гаспадыня суседняй кватэры насамрэч не проста выпадковая знаёмая…

У галоўных ролях “Нязванага госця” бліскуча выканалі вядучыя артысты Алена Баярава і Андрэй Дабравольскі. Алена вядома гледачам па ролях у шматлікіх расійскіх серыялах і фільмах.

Гледачы атрымалі асалоду ад цікавага сюжэту і мастэрства ігры акцёраў.